*Мікалай Забаўскі*

# 1906 год паклаў пачатак рускаму парламентарызму:

## Дэпутаты ў Дзяржаўную думу ад Мінска і Міншчыны, чые прозвішчы былі тады на слыху ў Гедройцаў

Ежы Гедройц нарадзіўся ў 1906 годзе — знамянальным у палітычнай гісторыі Расійскай імперыі. Урэшце пачаў сваю дзейнасць «парламент» (Дзяржаўная дума). Пры ўдзеле манархаў было падрыхтавана некалькі праектаў увядзення народнага прадстаўніцтва яшчэ ў першай палове XIX ст. Але толькі рэвалюцыя 1905 г. падштурхнула ўрад да рашучых заканадаўчых змен.

Асвятленне гісторыі рэвалюцыі і Дзяржаўнай думы з'яўляецца аб'ектам сутыкнення розных накірункаў гістарычнай навукі як у мінулым, так і ў сучасным грамадскім жыцці. Асаблівую цікавасць выклікаюць палітычныя лідэры пачатку XX ст., многія з якіх сталі дэпутатамі Расійскай думы. У іх ліку быў і Марыян Пётр Масоніус. Асоба М. Масоніуса, паколькі ён у 1915–1918 гг. быў дырэктарам і выкладчыкам Мінскай гімназіі, у якой вучыўся Е. Гедройц (паводле яго ўспамінаў), вартая нашай спецыяльнай увагі. Гэты вядомы вучоны з'яўляецца аўтарам кніг «Нарыс гісторыі польскай філасофіі» (СПб, 1891, на рускай мове), нарысаў па эстэтыцы (1884), «Раздваенне польскай думкі: Літва і Карона» (1896), «Сем сусветных загадак» (1897; тры апошнія пазіцыі выдадзены ў Варшаве на польскай мове). Яму ж належыць артыкул «Выбары ў Міры», апублікаваны ў «Gazecie Warszawskiej» у 1906 г., і іншыя працы па філасофіі, эстэтыцы, педагогіцы, грамадазнаўству. Нарадзіўся ён у 1862 г. у Навагрудскім павеце ў дваранскай сям'і, па іншых звестках у Курску [1]. Скончыў гімназію, матэматычны факультэт Варшаўскага і філасофскі факультэт

[1] Zycka L., Łęska M. Działalnosc popowstaniowa Polakow na Ziemi Minskiej. Warszawa, 1939. S. 264–265.

Лейпцыгскага універсітэтаў, дзе атрымаў ступень доктара філасофіі. Як відаць з публікацыі ў газеце «Беларуская думка» [2], М. Масоніус лічыў сябе беларусам. Летам 1918 г. выкладаў на курсах беларусазнаўства гісторыю беларускай мовы. Нейкі час працаваў дырэктарам гімназіі ў Нясвіжы, упарадкоўваў там архіў і бібліятэку Радзівілаў. Потым стаў прафесарам Віленскага універсітэта, чытаў у ім лекцыі па беларускай літаратуры [3].

Памяць аб прафесары і дырэктары Мінскай гімназіі Масоніусе рэдактар «Культуры» Ежы Гедройц пранёс праз усё жыццё. Вучоны мог паўплываць на ўзнікненне ў ім цікавасці да беларускіх спраў.

У сувязі з выбарамі ў Дзяржаўную думу Расіі разгарнулася барацьба партый і груп рознай ідэалагічнай арыентацыі за ўплыў на народныя масы і галасы выбаршчыкаў. Інтарэсы ўрадавага лагера на выбарах абаранялі памешчыцка-манархічныя партыі. Найбольш уплывовай з іх быў «Саюз рускага народа». Кіраўнікамі рэгіянальных саюзаў сталі буйныя землеўласнікі, губернскія і павятовыя прадвадзіцелі дваранства. Важную ролю ў гэтай справе адыграла праваслаўнае духавенства. Часта было дастаткова ўказання святара, каб цэлая вёска далучалася да СРН.

Прызнаным лідэрам акцябрыстаў у заходніх губернях з'яўляўся Г. Шмід. Аддзел знаходзіўся пад апекай мясцовай адміністрацыі, а газета Г. Шміда «Мннское слово» карысталася поўнай манаполіяй. У Мінскай губерні існавала афіцыйная забарона на дзейнасць кадэтаў, паліцыя не дапускала іх сходаў. Гэтыя акалічнасці вымушалі канстытуцыйных дэмакратаў пераносіць сваю дзейнасць у нацыянальныя групы польскіх, яўрэйскіх і літоўскіх арганізацый.

Напярэдадні выбараў у Дзяржаўную думу паглыбілася палітычная дыферэнцыяцыя сярод палітычна актыўнай часткі польскага насельніцтва ў Беларусі і Літве — так званых краёўцаў. 7 лютага 1906 г. на Устаноўчым сходзе ў Вільні было абвешчана стварэнне Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі. Яе арганізатарам і кіраўніком стаў віленскі біскуп барон Э. Роп. Практычна адначасова ён пачаў выдаваць тры газеты: «Nowiny Wileńskie», «Przyjaciel Ludu», «Towarzysz Pracy». Краёўцы адчувалі беларускія або літоўскія карані, выйшлі з той часткі грамадства, свядомасць якой

---

[2] Праф. Масоніус // Бел. Думка (Вільня). 1919. 23 мая.

[3] Тамсама.

акрэслівала формула «ліцвін па паходжанні, паляк па нацыянальнасці», выступалі за аўтаномію беларуска-літоўскага краю.

У студзені 1906 г. у Мінску адбыўся II з'езд Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ), на якім была прынята новая праграма і арганізацыйны статут. Для Беларусі Грамада патрабавала дзяржаўнай аўтаноміі з сеймам у Вільні. БСГ байкатавала Думу. Лідэры вядучай партыі беларусаў патрабавалі, каб «кожны народ меў свой сэйм у сваім краі!» Ініцыятыва байкоту выбараў у Думу належала бальшавікам.

Выбары былі шматступенчатымі, праходзілі па сялянскай, гарадской, землеўладальніцкай і рабочай курыях. Дэпутаты абіраліся на апошняй стадыі — на губернскіх выбарчых сходах, куды накіроўваліся выбаршчыкі ад кожнай з курый.

У Мінскай губерні выбаршчыкі размежаваліся на тры групы: палякаў-землеўладальнікаў (звыш 60 галасоў), праваслаўных сялян (каля 50 чалавек) і яўрэяў ад гарадоў (каля 20 чалавек). Стварыўшы блок з выбаршчыкамі ад гарадской курыі, землеўладальнікі-палякі перакрэслілі ўсе намаганні сялян атрымаць для сябе хаця б адно (акрамя абавязковага) месца. Ацаніўшы сітуацыю, сяляне выбралі свайго (абавязковага) дэпутата — С. Гатоўчыца (селяніна з Навагрудскага павета, праваслаўнага, выпускніка народнага вучылішча ў Навагрудку) і пакінулі сход, падаўшы наступную заяву: «Мы — выбаршчыкі — прадстаўнікі 2 млн. рускага насельніцтва, назіраючы перавагу выбаршчыкаў (400 тыс. яўрэяў і палякаў), не жадаем прымаць далейшага ўдзелу ў выбарах і маўклівай згодай пакідаем без пярэчанняў несправядлівасць выбарчага закона ў прымяненні да краю са змешаным насельніцтвам». Разам з сялянамі сход пакінулі і рускія землеўладальнікі — І. Пана-Афанасапула, М. Мыслін, а таксама святар А. Пісарчык.

Польскія землеўласнікі максімальна выкарысталі новае размеркаванне палітычных сіл і правялі ў думу ажно семярых сваіх прадстаўнікоў ад Мінска і Міншчыны. Акрамя М. Масоніуса дэпутатамі сталі:

**Друцкі-Любецкі** Геранім Эдвінавіч, князь. Нарадзіўся у 1861 г. у Пінску ў сям'і мясцовага землеўладальніка. Скончыў юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Займаўся сельскай гаспадаркай. Член савета Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, старшыня праўлення Мінскага камерцыйнага банка. Зямельныя уладанні Г. Друцкага-Любецкага знаходзіліся ў асноўным на Палессі.

Адзін з заснавальнікаў у I Думе ад імя польскіх дэпутатаў з Беларусі і Літвы самастойнай тэрытарыяльна-нацыянальнай групы («Тэрытарыяльнае кола»).

**Скірмунт** Раман Аляксандравіч. Нарадзіўся ў 1868 г. у Пінскім павеце ў дваранскай сям'і. Скончыў Рыжскую гімназію. Займаўся сельскай гаспадаркай. Член савета Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі. Як публіцыст горача адстойваў прынцып мірнага суіснавання нацыянальнасцей. Аўтаноміст. У 1918–1920 гг. стаў значным беларускім дзеячам.

**Любанскі** Яўстафій Іванавіч. Нарадзіўся ў 1859 г. у дваранскай сям'і. Адзін з найбагацейшых памешчыкаў у заходніх губернях. Валодаў маёнткам пад Мінскам. Член таварыства сельскай гаспадаркі, старшыня лясной біржы, гласны Мінскай гарадской думы, вядомы грамадскі дзеяч. З'яўляўся дэлегатам маскоўскага з'езда земскіх і гарадскіх дзеячаў як прадстаўнік ад таварыства сельскай гаспадаркі. Па палітычных поглядах быў прыхільнікам кадэтаў, хаця і не падзяляў іх падыходы да аграрнай рэформы і рэформы выбарчай сістэмы.

**Вішнеўскі** Ян Янавіч. Землеўладальнік з вышэйшай адукацыяй. Вырашэнне аграрнага пытання лічыў магчымым толькі пасля ўсебаковага высвятлення на месцах органамі мясцовага самакіравання запатрабаванняў на зямлю. Лічыў, што польскае пытанне неабходна вырашыць, прадастаўляючы палякам права шырокага мясцовага самакіравання. Належаў да краёўцаў.

**Янчэўскі** Віктар Восіпавіч. Гласны Мінскай гарадской думы. Як прадстаўнік ад Мінска ўдзельнічаў у земска-гарадскіх з'ездах і выбіраўся членам арганізацыйнага бюро. У Мінску быў надзвычай папулярны, прымаў удзел у рабоце шматлікіх мясцовых гарадскіх устаноў. У гарадской думе вызначыўся як спецыяліст па фінансавых пытаннях. Быў прыхільнікам кадэтаў.

**Лядніцкі** Аляксандр Робертавіч. Нарадзіўся ў 1866 г. Скончыў Мінскую гімназію, Маскоўскі універсітэт і Дзямідаўскі ліцэй. Займаўся адвакатурай. Член маскоўскага савета прысяжных павераных, гласны Смаленскага павятовага земскага сходу. Прымаў удзел у рабоце саюза і з'ездаў адвакатаў. Калі ў Маскве ўтварылася Канстытуцыйна-дэмакратычная партыя, актыўна ўключыўся ў яе работу. Супрацоўнічаў у некалькіх рускіх («Русская мысль», «Русское ведомство», «Русское слово») і польскіх газетах і часопісах. У 1887 г. у адміністрацыйным парадку быў высланы з Масквы, за прамовы

на передвыбарчых сходах прыцягваўся да адказнасці па 129-м артыкуле. Належаў да Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі і «Тэрытарыяльнага кола».

У адпаведнасці з папярэдняй дамоўленасцю адно месца дасталася гарадскім выбаршчыкам. Дэпутатам стаў прысяжны паверany, лідэр сіяністцкага руху ў Расіі, арганізатар шматлікіх сіяністцкіх гурткоў, удзельнік усіх базельскіх кангрэсаў С. Розенбаўм.

Галоўным у Думе стала аграрнае пытанне. Кадэты прапанавалі стварыць «дзяржаўны зямельны запас» з казённых, удзельных, манастырскіх і часткі памешчыцкіх зямель, якія здаваліся ў арэнду ці ўвогуле не апрацоўваліся. Гэтыя землі памешчыкі павінны былі прадаць па «справядлівай» ацэнцы ў зямельны фонд для надзялення сялян. Такія меры сялянскія дэпутаты ў Думе палічылі недастатковымі. Яны аб'ядналіся ў фракцыю «трудавікоў» і прапанавалі свой праект вырашэння аграрнага пытання. У ім прадугледжвалася ліквідацыя памешчыцкага землеўладання, перадача ўсёй зямлі ў агульнанародную ўласнасць.

Прыхільнікі канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі (13 дэпутатаў) стварылі ў пачатку мая самастойную тэрытарыяльна-нацыянальную парламенцкую групу — «Тэрытарыяльнае кола» (кіраўнікі князь Г. Друцкі-Любецкі і А. Лядніцкі (абодва — Мінская губерня), Ч. Янкоўскі (Віленская губ.). Акрамя таго, у склад «кола» ўвайшлі ад Мінскай губерні Р. Скірмунт, Я. Любанскі, Я. Вішнеўскі, В. Янчэўскі, М. Масоніус. Прадстаўнікі кола сцвярджалі, што «без усталявання аўтаноміі ці без абласнога кіравання правільнае вырашэнне аграрнага пытання немагчыма, а прымяненне адной аграрнай меры для ўсіх правінцый і абласцей недапушчальна». Супраць кадэцкага аграрнага праекта выступаў і М. Масоніус. Ён заявіў, што ў выніку нацыяналізацыі сяляне «атрымаюць не зямлю, а паперу аб ёй».

Тэксты выступленняў дэпутатаў у Думе змяшчаліся на старонках газет і часопісаў, у тым ліку і мясцовых. Выбаршчыкі пільна сачылі за сваімі дэлегатамі, і таму прозвішчы ўсіх дзевяці прадстаўнікоў ад Мінска і Міншчыны былі добра знаёмыя, і, безумоўна, яны аказвалі ўплыў на фарміраванне поглядаў грамадства [4].

[4] Падрабязней аб першай думе гл.: Забаўскі М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906–1917 гг.). Мн., 1999; Шульгин В. Годы – Дни – 1920. М., 1990; Смалянчук А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй: Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях 1864 – люты 1917 г. СПб., 2004.

20 чэрвеня 1906 г. была апублікавана ўрадавая праграма па аграрным пытанні. Але левыя фракцыі выступілі супраць урадавай пазіцыі. Правыя запатрабавалі роспуску Думы. Указам ад 9 ліпеня 1906 г. Мікалай II распусціў першы расійскі «парламент».